ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 17 (541) | Субота, 14 мая 1983 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## У ПАМЯЦІ НАЗАЎСЁДЫ

Дзень Перамогі — радаснае і адначасова вельмі хвалюючае свята. Асабліва горка ўсведамляць у гэты дзень, што не ўсе дачакаліся светлага і мірнага неба, а аддалі за Вялікую Перамогу самае дарагое, што ёсць у чалавека — сваё жыццё. І прыходзяць 9 мая да помнікаў, магіл і абеліскаў сівыя ветэраны з баявымі ўзнагародамі на грудзях, прадстаўнікі маладога пакалення, якое нарадзілася і вырасла ўжо пад мірным небам. Нізка схіляюць яны галовы перад неўмiручай памяццю загінуўшых за светлую будучыню, аддаюць ім даніну вялікай павагі.

9 мая сабраліся ва універсітэцкім парку на мітынг студэнты, выкладчыкі, ветэраны, якія працуюць у ГДУ. Мітынг, прысвечаны ўшанаванню памяці загінуўшых воінаў і партызан, пахаваных у студэнцкім парку, адкрыў сакратар камітэта камсамола універсітэта С. Аўсеенка. Ён прадаставіў слова выкладчыку кафедры грамадзянскай абароны падпалкоўніку ў адстаўцы А. А. Баскакаву. З хваляваннем успамінаў ветэран былыя баі, цяжкія, горкія страты франтавых сяброў і радасць перамогі.

Як адказ быць заўсёды пільнымі, гатовымі мацаваць мір на зямлі прагучала выступленне студэнта 4-га курса фізічнага факультэта І. Асан-Джалалава.

Мінутай маўчання прысутныя ўшанавалі памяць загінуўшых воінаў, да магіл і абеліска ўсклалі вянкі і жывыя кветкі.

## ПАТРАБУЕ СЕСІЯ

У студэнтаў універсітэта пачынаецца гарачая пара — вясновая залікова-экзаменацыйная сесія. На пэўны час давядзецца забыць пра свае захапленні, узяць у рукі канспекты і падручнікі, каб прывесці ў сістэму веды, набытыя на працягу навучальнага года ці вучэбнага семестра.

Цяперашнюю сесію абавязаны здаваць 2890 студэнтаў. На геалагічным факультэце яна ўжо ўзяла старт. У пачатку мая гр. Г-21 здавала экзамен па філасофіі, гр. Г-22 — па мінералогіі, гр. Г-31 — па карысных выкапнях, гр. Г-32 — па літалогіі, гр. Г-33 — па грунтазнаўству. Пачатак, на жаль, аказаўся не зусім прыемным. Дзевяць студэнтаў атрымалі нездавальняючыя адзнакі: А. Данілін—па філасофіі; В. Міхалка, В. Атанасаў ,А. Патапейка, І. Феакцістава — па мінералогіі; С. Аўрамчыкаў, А. Жалязноў, А. Мохараў — па карысных выкапнях; М. Пракапенка — па грунтазнаўству.

Неабходна сказаць і аб тым, што такія студэнты геафака як В. Бялецкі, У. Курылін, У. Тур (трэці курс), А. Конеў і Ю. Барабін (чацвёрты курс) маюць запазычанасць яшчэ за зімовую сесію.

Тыдзень таму назад закончылася вясновая экзаменацыйная сесія ў чацвёртакурснікаў біялагічнага факультэта. Парадавацца поспехамі тут таксама нельга. 5 студэнтаў атрымалі нездавальняючыя адзнакі па біяфізіцы. Былі «правалы» і на іншых экзаменах. А С. Хрычкова і Ж. Шугалей па незразумелых прычынах да гэтага часу не маюць заліку па фізічнаму выхаванню.

Сёння нельга не ўспомніць вынікі мінулай зімовай экзаменацыйнай сесіі. Пасяхавасць склала ўсяго толькі 89,2 прац. Узровень даволі нізкі. У гэтым бачыцца недапрацоўка не толькі студэнтаў, але і асобных выкладчыкаў, кафедр і дэканатаў, што не павінна паўтарыцца. Цяпер неабходна дакладна вызначыць расклад кансультацый па кожнай дысцыпліне і выкладчыкам пастаянна знаходзіцца ў рабочы час на кафедрах, каб студэнт змог атрымаць кансультацыю па любому незразумеламу для яго пытанню. Важна асаблівую ўвагу звярнуць на самастойную працу будучых маладых спецыялістаў. Тут патрабуецца чоткая работа лабараторый, кабінетаў, чытальных залаў і бібліятэк.

На некаторых факультэтах і ў многіх акадэмічных групах універсітэта накоплены каштоўны вопыт работы ў перыяд падрыхтоўкі да залікаў і экзаменаў вучэбна-выхаваўчых камісій і саветаў выдатнікаў. Яны замацоўваюць мацнейшых студэнтаў за адстаючымі, наладжваюць грамадскія экзамены па найбольш складаных прадметах. Як правіла, у сваіх малодшых таварышаў веды правяраюць старшакурснікі. Усё гэта дае станоўчыя вынікі. Пастаноўцы такой шэфскай работы можна павучыцца на гісторыка-філалагічным факультэце. У пэўнай ступені дзякуючы і ёй тут за мінулую зімовую сесію быў самы высокі працэнт паспяховасці — 97,7.

Добра пастаўлена шэфская работа таксама ў некаторых групах і на курсах эканамічнага і матэматычнага факультэтаў. Яе патрэбна ўсямерна пашыраць і ўдасканальваць. Да тых жа студэнтаў, якія не праяўляюць належнай стараннасці і жадання вучыцца, з большай патрабавальнасцю павінны адносіцца камсамольскія арганізацыі. Да гультаёў і прагульшчыкаў мы не павінны адносіцца цярпліва.

Да пачатку сесіі ў дэканаты трэба здаць усе заліковыя ведамасці па прадметах, каб своечасова выдаць распараджэнні аб допуску студэнтаў да экзаменаў. На кожнай кафедры цяпер мэтазгодна арганізаваць індывідуальныя кансультацыі па асобных дысцыплінах. Да гэтай справы можна прыцягваць і студэнтаў-выдатнікаў. Сваю ролю тут павінны адыграць таксама куратары акадэмічных груп.

**Н. ПАПКОВА,**
**загадчыца вучэбнага аддзела.**

* * *

**На геалагічным факультэце пачалася вясенняя залікова-экзаменацыйная сесія. Хутка студэнты адправяцца на практыку, а пакуль іх асноўная задача — паспяхова вытрымаць экзамены.**

**Адзін з лепшых студэнтаў на факультэце — Алег Тупіцкі. Ён актыўна займаецца навуковай работай, у вольны час захапляецца горным турызмам. Прадмет, якому Алег аддае перавагу, — мінералогія.**

**НА ЗДЫМКУ: А. ТУПІЦКІ за падрыхтоўкай да экзамена.**

**Фота С. Коваля, студэнта 2-га курса геафака.**

* * *



## У ПАРТКОМЕ

11 мая адбылося чарговае пасяджэнне партыйнага камітэта універсітэта. Абмеркавана пытанне аб дзейнасці грамадскага дэканата па ўдасканальванню прафарыентацыі і рабоце са стажорамі. З дакладам выступіў яго дэкан, старшы выкладчык факультэта фізвыхавання В. І. Селіванаў. Яго дапоўнілі загадчыца вучэбнага аддзела Н. І. Папкова і загадчыца вучэбнай і вытворчай практыкі Ю. Д. Алейнік. Выступілі таксама загадчык кафедры беларускай мовы прафесар У. В. Анічэнка, рэктар універсітэта акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць, іншыя члены парткома.

Адзначана, што створаным у мінулым годзе грамадскім дэканатам праводзіцца значная работа са стажорамі і па прафарыентацыі. У прынятай пастанове прадугледжаны меры па далейшаму яе ўдасканальванню і павышэнню выніковасці.

Партыйны камітэт разгледзеў кадравыя і некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ІМЯ ЯГО—НЕЎМІРУЧАЕ

На трэцім курсе біялагічнага факультэта праведзена студэнцкая канферэнцыя, прысвечаная 165-годдзю з дня нараджэння К. Маркса.

Уступным словам канферэнцыю адкрыла в. а. дацэнта кафедры палітэканоміі Н. П. Пухава.

Студэнт групы Б-32 А. Кароль нагадаў удзельнікам канферэнцыі біяграфію К. Маркса. Грунтоўна асвятліла пытанне «Маркс аб дваістым характары працы» трэцякурсніца Т. Алекса.

«Маркс і сучаснасць» — з такім дакладам выступіў на канферэнцыі студэнт групы Б-31 Г. Казулька.

Вялікую цікавасць выклікала выстаўка літаратуры, прысвечанай жыццю і дзейнасці К. Маркса.

**Н. ГУРЭВІЧ,**
**галоўны бібліёграф бібліятэкі.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, кафедра радыёфізікі горача віншуюць малодшага навуковага супрацоўніка ЦЕПЛЯКОВА Віктара Герардавіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.**

* * *

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра беларускай мовы горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ЕЎТУХОВА Уладзіміра Дзмітрыевіча з выпадку прысуджэння яму ВАКам вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.**

## АБ УДАСКАНАЛЬВАННІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

У першай дэкадзе мая ў Мінску адбыўся двухдзённы семінар на тэму: «Аб далейшым удасканальванні сацыялістычнага спаборніцтва ў вышэйшых навучальных установах». У яго рабоце прынялі ўдзел старшыні абкомаў прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў, рэктары і прарэктары ВНУ рэспублікі, старшыні прафкомаў, старшыні камісій вытворча-масавай работы прафсаюзных камітэтаў.

Уступным словам семінар адкрыў намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР С. А. Малевіч. З дакладамі «Аб арганізацыі і далейшым удасканальванні сацыялістычнага спаборніцтва ў вышэйшых навучальных установах» выступілі старшыня БРК прафсаюза С. М. Собалева і начальнік упраўлення ВНУ Мінвуза БССР У. П. Воднеў.

У сваім дакладзе С. М. Собалева станоўча ацаніла практыку арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ў нашым універсітэце.

Удзельнікі семінара абмяняліся вопытам работы па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ў ВНУ. З цікавасцю было выслухана паведамленне аб вопыце яго арганізацыі ў Маскоўскім інстытуце нафтахімічнай і газавай прамысловасці імя Губкіна, з якім выступіў старшыня прафкома інстытута А. М. Дзмітрыеўскі.

Тэмай выступлення старшыні вытворча-масавай камісіі прафкома нашага універсітэта Ю. А. Кашына было: «Сацыялістычнае спаборніцтва і ацэнка эфектыўнасці работы калектыву вышэйшай навучальнай установы».

На семінары выступіў сакратар ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў Ю. Г. Нікіфараў.

У рабоце семінара прыняў удзел інструктар ЦК КПБ А. П. Кандыба.

Удзельнікі семінара наведалі БДУ імя У. І. Леніна і Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага, дзе азнаёміліся з гэтымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, з арганізацыяй у іх сацыялістычнага спаборніцтва.

**М. МУРАШКА,**
**старшыня прафкома ГДУ.**

